ДУА “Пагост-Загародская сярэдняя школа імя славянскіх асветнікаў Кірыла і Мяфодзія” Пінскага раёна
Аўтар: Мелюх Таццяна Мікалаеўна, настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі

*(урок матэматыкі рэкамендаваны для правядзення ў 1 класе)*

**Прадмет:** матэматыка
**Клас:** 1
**Урок № 57: Тэма ўрока:** Адзінка часу – гадзіна

**Мэта і задачы:** пазнаёміць з адзінкай вымярэння часу – гадзінай; вучыць вызначаць час з дакладнасцю да гадзіны; замацоўваць навыкі вылічэнняў на аснове ведаў дзесятковага саставу лікаў.

**Задачы асабістага развіцця:** садзейнічаць развіццю якасці мыслення, а таксама стварэнню ўмоў для развіцця разумовых навыкаў.

**Абсталяванне:** набор геаметрычных фігур; прадметныя малюнкі, карткі з лічбамі і знакамі; веер з лічбамі, макет цыферблата гадзін.

## Ход урока

### I. АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ЭТАП.

**Настаўнік.** Сёння на ўрок я запрасіла … Паравозіка з Рамашкава. Паравозік, як і вы, вельмі любіць лічыць. Давайце палічым разам з ім.

### II. ПАДРЫХТОЎКА НАВУЧЭНЦАЎ ДА ПРАЦЫ НА АСНОЎНЫМ ЭТАПЕ.

**Вуснае лічэнне**
1.Лічэнне ад 1 да 20 у прамым і адваротным парадку.
Лік праз адзін лік, пачынаючы з 1 (3, 5, 7).
Лік праз два лікі, пачынаючы з 2 (4, 6, 8).
Назавіце суседзяў лікаў 8, 10, 12.
Які лік стаіць паміж лікамі 8 і 10, 11 і 13?
Дзесяць – гэта 2 і колькі? 4 і …, 7 і …, 10 і … .
Назавіце колькі дзясяткаў і адзінак змяшчае лік 14, 13, 11.
2. Павялічце лікі на адзін.

| 10 | 12 | 14 | 9 | 13 |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

3. Нарысуйце фігуру, якой не хапае.




3.Вызначце, у якім замку жыве прынцэса, калі вядома, што яна жыве не ў першым, не ў самым высокім і не ў самым шырокім.



**Настаўнік.** Паравозік падрыхтаваў для вас загадку:
*На талерцы роўным кругам*
*Ходзяць стрэлкі адна за адной.* (Гадзіннік.)
Для чаго патрэбны гадзіннікі?
Тэма нашага ўрока – "Адзінка часу – гадзіна". Сёння на ўроку мы пагаворым пра час, будзем вучыцца вызначаць час з дакладнасцю да гадзіны.

## III. ЭТАП ЗАСВАЕННЯ НОВЫХ ВЕДАЎ І СПОСАБАЎ ДЗЕЯННЯЎ.

**Настаўнік.** Падумайце і скажыце, якія бываюць гадзіннікі? (Настаўнік пашырае адказы вучняў расказам пра сонечныя, пясочныя, вадзяныя гадзіннікі.)
Ці ведаеце вы, што існуе нават “жывы будзільнік”? Каго так называюць?

*Настаўнік дэманструе цыферблат гадзінніка.*

Гэта цыферблат, па крузе размешчаны лічбы. Давайце назавем іх: 1, 2, … 12.
Што абазначае вялікая стрэлка? Маленькая стрэлка?
Якая стрэлка рухаецца хутчэй? Чаму?
Калі на гадзінніку вялікая стрэлка накіравана ўверх, вось так, на лік 12 (паказвае), то маленькая будзе паказваць, які час.

Настаўнік прапануе разгарнуць вучэбны дапаможнік [1, с. 16] і рагледзець малюнкі ў рамцы, задае пытанні аб тым, які час паказвае першы гадзіннік, другі, трэці.

**Настаўнік**. Растлумачце, чаму першы гадзіннік паказвае 1 гадзіну, другі – 9 г, трэці – 6 г?

Настаўнік прапануе у заданні № 1 [1, с. 16] вызначыць час, які паказваюць гадзіннікі. А заданні № 2 [1, с. 16] не толькі вызначыць час, які спачатку паказвалі гадзіннікі, але і час, які стаў праз пэўны прамежак часу.

Вучні разам з настаўнікам знаёмяцца з умовай задачы № 3 [1, с. 16], тлумачаць схему і рашаюць яе.

**Настаўнік**. Пакладзіце на парту столькі кругоў, колькі дзеці каталіся з горкі. А цяпер пакладзіце столькі квадратаў, колькі гадзін яны ляпілі снегавіка. Палічыце фігуры. Складзіце з картак рашэнне гэтай задачы. Назавіце адказ

*Дзеці выконваюць рухі, якія нагадваюць дзеянні, апісаныя ў фізкультхвілінцы.*

**Фізкультхвілінка**

Раз, два, тры, чатыры, пяць –
Тупаем нагамі.
Раз, два, тры, чатыры, пяць –
Будзем нахіляцца.

Раз, два, тры, чатыры, пяць –
Пляскаем рукамі
Раз, два, тры, чатыры, пяць –
Сядзем зноў займацца.

**Настаўнік**. У заданні № 4 [1, с. 17] я буду называць прыклад, а вы з дапамогай лікавага веера паказваць адказ.

У заданні № 5 [1, с. 17] вучні выбіраюць прыклад, які адпавядае пэўнай схеме. А у заданні № 6 [1, с. 17] дакладнае рашэнне.

**Настаўнік**. Давайце пачастуем нашага Паравозіка цукеркамі. Паглядзіце колькі цукерак у заданні № 6 [1, с. 17]. Якога яны колеру? Выберыце толькі два цукеркі. Назавіце свае варыянты.

***Фізкультхвілінка для вачэй***

### IV. ЭТАП ПРЫМЯНЕННЯ ВЕДАЎ
### І СПОСАБАЎ ДЗЕЯННЯЎ

**Настаўнік.** Састаўце і рашыце прыклады, запішыце іх у сшытак [4, с. 9].

Пасля выкананання задання ажыццяўляецца праверка, ацэньваюцца работы па крытэрыі “правільнасць/няправільнасць”.

Вучні запісваюць лікі ў заданні № 2 [2, с. 9]. Затым арганізуецца ўзаемаацэнка ў парах па крытэрыі “акуратнасць/неахайнасць”.

Настаўнік прапануе вучням запісаць кароткі запіс задачы № 3 [2, с. 9] і рашыць яе. Пасля выкананання задання ажыццяўляецца праверка, ацэньваюцца работы па крытэрыі “правільнасць/няправільнасць”. А ў заданні № 4 [2, с. 9] вучні знаходзяць “Пятае лішняе”.

### V. ЭТАП ЗАМАЦАВАННЯ НОВЫХ ВЕДАЎ
### І СПОСАБАЎ ДЗЕЙНАСЦІ.

1. Гульня “Закрэслі лішні” № 5 [3, с. 31].

*Вучням трэба знайсці “лішні” цыферблат гадзінніка і закрэсліць яго.*



**Настаўнік.** Чаму менавіта цыферблат гэтага гадзінніка “лішні”? Які час паказваюць гадзіннікі, што засталіся.

2. У заданні № 3 [3, с. 30] трэба пад першым цыферблатам запісаць паказанні гадзінніка, а на другім – намаляваць стрэлкі ў адпаведнасці з указаным значэннем часу.



## VI. ЭТАП ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ УРОКА.

**Настаўнік.** Успомніце мэты, якія ставілі?

Наколькі паспяховым быў кожны ў дасягненні мэт, пакажа заданне “?” [1, с. 17].

Што абазначае маленькая стрэлка? Вялікая?

Хто можа паказаць на цыферблаце 5 гадзін? 2 гадзіны? 1 гадзіну?

**Рэфлексія “Паравозік”.**

1 2 3



Кожны вучань дорыць Паравозіку з Рамашкава кветку (рамонак) і размяшчае яе ў адзін вагончык па выбару:

**1 вагончык** – умею вызначаць і магу паказаць на цыферблаце час;

**2 вагончык** – трэба дапамога , каб паказаць час на цыферблаце гадзінніка;

**3 вагончык** – не ўмею вызначаць і паказваць час на цыферблаце гадзінніка.

Дзякуй за ўрок!

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. **Матэматыка:** вучэбны дапаможнік для 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. 2 частка. //Г.Л.Мураўёва., М.А.Урбан. – Мінск: НІА, 2019.
2. **Матэматыка:** рабочы сшытак: вучэбны дапаможнік для 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. 2 частка. //Г.Л.Мураўёва., М.А.Урбан., С.В.Гадзаава., С.А.Капылова. – Мінск: НІА, 2019.
3. **Матэматыка.** 1 клас: самастойныя і кантрольныя работы: варыянт-1; /Г.Л.Мураўёва., М.А.Урбан., С.В.Гадзаава., С.А.Капылова. – Мінск: Аверсэв, 2020. – 78 с. : іл.